“Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць”

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
17.05.2015 01:00





Ад 1 па 3 мая ў Смаргоні адбыліся XXII Дыяцэзіяльныя дні моладзі. У гэты час горад выглядаў не так, як звычайна, паколькі ў парафіі св. Міхала Арханёла сабралася каля двух тысяч маладых людзей з Гродзенскай дыяцэзіі і з-за яе межаў, якія прыбылі сюды, каб супольна праслаўляць Бога малітвай, спевам і танцам, разважаючы над дарам чыстага сэрца. Усё распачалося ў пятніцу 1 мая, калі на чыгуначным вакзале ў Гродне сабралася моладзь з гродзенскіх і навакольных парафій, каб спецыяльна падрыхтаваным цягніком вырушыць у Смаргонь на чарговыя Дні моладзі Гродзенскай дыяцэзіі. Але яшчэ больш маладых людзей чакала на вакзале ў Лідзе, дзе цягнік затрымаўся, каб прыняць чарговых пасажыраў, якія накіроўваліся на гэтую вялікую і важную падзею ў жыцці гродзенскага Касцёла. Час падарожжа праляцеў вельмі хутка, і маладыя людзі аказаліся ў Смаргоні, дзе іх чакалі жыхары горада разам са сваімі душпастарамі. Цікава было назіраць за рэакцыяй многіх людзей, якія, здавалася, не былі ў курсе і не маглі зразумець, адкуль прыехала так шмат моладзі і якая мэта іх прыезду. †

Спачатку рассяленне ў людзей з добрым сэрцам, якія адчынілі дзверы сваіх дамоў і кватэр для такой вялікай колькасці моладзі. Затым супольная адарацыя Найсвяцейшага Сакраманту на прыкасцёльным пляцы і супольная Эўхарыстыя на распачацце Дзён моладзі, якую ўзначаліў Яго Эксцэленцыя кс. бп Юзаф Станеўскі, дапаможны біскуп Гродзенскай дыяцэзіі, які таксама скіраваў да маладых вернікаў Божае слова. Важнай падзеяй першага дня гэтай сустрэчы была таксама канферэнцыя на тэму: “Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць” (Мц 5, 8), у якой была асаблівым чынам звернута ўвага на чысціню ўчынкаў, вачэй і мовы, а таксама на тое, што толькі той, хто мае чыстае сэрца, можа любіць Бога і іншага чалавека. Праграму працягнуў пагодны вечар і забавы, завяршэннем якіх была супольная малітва і пастарскае бласлаўленне, што ўдзяліў ксёндз біскуп Юзаф.

“Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць”

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
17.05.2015 01:00

Д





“Шчаслівыя чыстыя сэрцам, бо яны Бога ўбачаць”

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
17.05.2015 01:00



